PolotskSU



**УДК 351.853.3(476.5)+904:726.82(476.5)«13/17»**

# КАМЕННЫЯ НАДМАГІЛЛІ БЕЛАРУСКАГА ПАДЗВІННЯ XIV–XVIII стст.[1]

***В. У. ЧАРАЎКО***
***(Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт)***
)

*Разнастайныя каменныя канструкцыі ў выглядзе вымастак, абкладак, асобных валуноў, каменных крыжоў і іх спалучэнняў часта абазначаюць пахаванні Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. Яны сустракаюцца на сельскіх могілках рэгіёна, пераважна на левым беразе Заходняй Дзвіны. Прыродным фактарам, які садзейнічаў узнікненню каменных надмагілляў, з'яўляецца значная завалуненасць зямель Паўночнай Беларусі. Дакладная форма каменнага надмагілля можа быць устаноўлена толькі пры археалагічных раскопках. У артыкуле прапанавана класіфікацыя каменных надмагілляў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. у залежнасці ад канфігурацыі каменнай канструкцыі і абазначэння галавы/ног пахавання.*

***Ключавыя словы:*** *Беларускае Падзвінне, пахавальныя помнікі XIV–XVIII стст., пахаванні, грунтовыя магілы з каменнымі канструкцыямі, каменныя надмагіллі, археалагічныя раскопкі.*

Сельскія пахавальныя помнікі Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. часта маюць выразныя знешнія прыкметы: каменныя надмагіллі, разнастайныя па форме і канструкцыі. Дакладнае датаванне помнікаў магчыма толькі па выніках археалагічных раскопак, паколькі каменныя канструкцыі маглі выкарыстоўвацца як раней за XIV, так і пазней за XVIII ст. Але ў большасці выпадкаў асобныя вялікія валуны, каменныя крыжы, вымасткі, абкладкі і іх спалучэнні маркіруюць пахаванні позняга сярэдневякоўя — ранняга новага часу [2, с. 126, 136]. Прыроднай умовай распаўсюджанасці на тэрыторыі Беларускага Падзвіння каменных надмагілляў з'яўляецца значная завалуненасць рэгіёна (мал. 1) [28, с. 19].




**Малюнак 1. — Завалуненасць ворыўных зямель Беларусі**
*Заўвага:* паводле [28, с. 19].

Некаторыя археалагічныя помнікі былі вядомы мясцоваму насельніцтву як элементы ландшафту задоўга да пачатку навуковых даследаванняў. Найбольш прыкметныя з іх маглі выкарыстоўвацца ў якасці арыенціраў, аб чым ёсць звесткі ў пісьмовых крыніцах [34, с. 11]. Каменны крыж у якасці арыенціра згадваецца ў 1570 г. у акце межавання земляў панцырных баяр і сялян былой Полацкай эканоміі з маёнткамі князя Грыгорыя Агінскага [33, с. 209–211]. У 1569 г. зямянін Багдан Пышніцкі перадаў віцебскаму мешчаніну Дзмітрыю Якаўлевічу Стырыку ў карыстанне «зе́мли і ляда… прилеглые пообапол сторонам дороги великое, которая идет з Витебска до Илемницы, от волости Волок от креста каменнаго, от могильников на левой стороне едучы з замку Витебского». Побач з могільнікам размяшча-

[1] Работа выканана ў межах Дзяржаўнай праграмы навуковых даследаванняў «Эканоміка і гуманітарнае развіццё беларускага грамадства» на 2016–2020 гг. (падпраграма 12.1. «Гісторыя і культура», заданне 1.1.01. «Беларускія землі ў першабытную эпоху, сярэдневякоўе і ранні Новы час: археалагічныя помнікі, тэрыторыя, насельніцтва, эканоміка і культура», навукова-даследчая работа «Насельніцтва Полацкага Падзвіння ў I–II тыс. н.э.»).

PolotskSU



ліся і курганы-«валатоўкі» [33, с. 191]. Паколькі каменныя крыжы маглі маркіраваць не толькі пахаванне або могілкі, указанне на размяшчэнне крыжа побач з могільнікам і курганнай групай з'яўляецца каштоўным удакладненнем [10, с. 33–34; 22, с. 420–421].

У 1632 г. той жа каменны крыж у ваколіцах Віцебска фігураваў у выраку Віцебскага гродскага суда. Зямянін Юрый Пынка сабраў каля дзясятка «слуг, подданых и помочников своих» і арганізаваў напад на суседзяў. Людзі Юрыя Пынкі, узброеныя «шаблями, бердышами, ручницами и киями», «нашодшо моцно и гвалтом на поле» зямяніна Васіля Янкоўскага. Уладальніка разам з жонкай і дачкой «киями и обухами побили и нелютостиве помордовали и челядь их порозгоняли». Інцыдэнт адбыўся ва ўрочышчы «подле каменнаго хреста» [33, с. 214].

Пры характарыстыцы каменных канструкцый трэба ўлічваць, што мы апісваем помнік не ў тым выглядзе, у якім ён быў створаны, а яго выгляд на момант вывучэння, праз некалькі стагоддзяў пасля стварэння [21, с. 17]. У шэрагу выпадкаў устанавіць першапачатковую форму каменнага надмагілля магчыма толькі гіпатэтычна. Напрыклад, даследаваны В.М. Ляўко могільнік Новы Болецк пашкоджаны ўпадзінамі [26, с. 465–466]. Надмагіллі шэрагу адкрытых Г.В. Ласкавым пахаванняў могільніка Вышадкі часткова разбураны рабаўнікамі і пашкоджаны каранямі дрэў [20, с. 149–153]. Каменныя канструкцыі вывучанага М.В. Клімавым могільніка Лучна II знішчаны пры будаўніцтве сядзібы [15, с. 123]. На могільніках Жарнасекава і Міхалінава выяўлены шматлікія падпахаванні, у выніку ажыццяўлення якіх першапачатковая канфігурацыя надмагілляў магла змяніцца [39; 42]. Таксама трэба ўлічваць, што надмагіллі могуць дапаўняцца камянямі ў запаўненні магілы. Дакладная форма канструкцый высвятляецца толькі пры археалагічных раскопках помніка (мал. 2).




**Малюнак 2. — Могільнік каля в. Івесь Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Раскоп 2013 г. Камяні:**
***а* – на ўзроўні дзённай паверхні; *б* – на глыбіні да 0,2 м; *в* – на глыбіні 0,2–0,4 м;**
***г* – на глыбіні 0,4–0,6 м; *д* – на глыбіні 0,6–0,8 м**

Каменныя надмагіллі абазначалі і надзейна абаранялі пахаванні пад імі, але маглі парушацца. Не было выключана «другаснае выкарыстанне» каменных крыжоў і буйных валуноў, калі пры ажыццяўленні пахавання яны браліся са старых, закінутых магіл. Падобная з'ява была зафіксавана Г.В. Штыхавым на могільніку каля в. Рудня Гарадоцкага раёна [44, с. 49]. У 1852 г. К.А. Гаворскі апісаў каменны крыж, узяты са старых могілак, перавезены ў фальварак Бяздзедавічы і пакладзены там у агародзе па загаду мясцовага памешчыка. Пры гэтым старыя могілкі былі амаль распаханы [5, с. 98]. У XIX ст. у полі каля мястэчка Лукомль Сенненскага павета (зараз вёска Лукомль Чашніцкага раёна) сяляне знайшлі і перавезлі да царквы вялікі каменны крыж, што мог застацца ад старых закінутых могілак, памяць аб якіх не захавалася [10, с. 37; 33, с. 218]. Маюцца і іншыя звесткі аб перанясенні каменных крыжоў [10, с. 41–42]. На

PolotskSU



другую палову XIX — пачатак XX ст. асаблівую актуальнасць у Беларусі набыла праблема малазямелля, што пацягнула за сабой распашку і ўвядзенне ў сельскагаспадарчы зварот плошчаў, занятых курганамі і гарадзішчамі [23, с. 11]. Прыклады распашкі сялянамі плошчаў, перад гэтым занятых грунтовымі могільнікамі з каменнымі канструкцыямі, былі зафіксаваны і ў сумежнай Наўгародскай зямлі [4, с. 2].

Пашкоджанне познесярэдневяковых помнікаў магло адбывацца ў выніку будаўнічых работ. Падобны прыклад зафіксаваны М. В. Клімавым на Лучанскім могільніку II Полацкага раёна. Могілкі ўзніклі на мяжы XII–XIII ці у першай палове XIII ст., а перапынілі сваё існаванне раней за канец XIV ст. [15, с. 123]. У XV — першай палове XVI ст. на месцы могілак паўстала феадальная сядзіба, будаўнікі якой не ведалі пра могільнік і ўзвялі пабудовы на ім, часткова парушыўшы каменныя надмагіллі [15, с. 121]. Выкарыстанне сялянамі буйных камянёў з надмагільных канструкцый для ўласных будаўнічагаспадарчых патрэб адзначана ў Мазовіі і на Падляшшы [31, с. 10].

Каменныя надмагільныя канструкцыі Беларускага Падзвіння пачалі рэгістраваць і апісваць у XIX ст. (мал. 3). Першая вядомая згадка маркіраваных каменнымі крыжамі познесярэдневяковых пахаванняў у асабістым ліставанні даследчыкаў-аматараў адносіцца да 1818 г. Старадаўнімі камянямі зацікавіўся інтэндант I арміі генерал-лейтэнант Я.Ф. Канкрын. Ён даў адпаведнае даручэнне падначаленым. У адказе на запыт наглядчык правіянцкай крамы ў Полацку Рэпін паведаміў аб каменных крыжах у маёнтку Бяздзедавічы і ў в. Экімань каля Полацка [1, с. 26, 30–39]. Ужо згаданы крыж у Бяздзедавічах меў выбітую дату: 1650 г. [14, с. 103–104].



**Малюнак 3. — Могільнікі Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з каменнымі надмагіллямі**
*Заўвага:* паводле [36, с. 19].

Праявай развіцця археалагічных ведаў стала публікацыя звестак аб помніках. Інфармацыю аб могільніку з каменнымі надмагіллямі і каменным крыжам каля в. Вітунічы Докшыцкага раёна прывёў Я. Тышкевіч. Аб’ект знаходзіўся недалёка ад радавога маёнтка графоў Тышкевічаў [10, с. 38; 48, s. 52]. Гранітны крыж каля маёнтка Сокарава, недалёка ад дарогі паміж Улай і замчышчам Суша адшукаў М.Ф. Кусцінскі [18, с. 92–93]. Надпіс на крыжы ўтрымліваў дату (1569 г.) і ўказанне на пахаванне «200 жовнеров», таму даследчыкам была зроблена выснова аб брацкай магіле вайскоўцаў [18, с. 93]. У адной з публікацый М. Ф. Кусцінскі прывёў і прамалёўку крыжа, у далейшым перадрукаваную А.П. Сапуновым (мал. 4) [30, с. 46–50]. К. Тышкевіч звярнуў увагу на існаванне могільнікаў, дзе побач размешчаны курганныя і жальнічныя пахаванні. Даследчык звязаў гэта з развіццём грамадства і пахавальных традыцый [49, s. 274–275].

PolotskSU





**Малюнак 4. — Каменны крыж каля маёнтка Сокарава**
*Заўвага:* паводле [30, с. 49].

Першыя палявыя даследаванні познесярэдневяковых пахаванняў на Беларускім Падзвінні ажыццявіў у 1852 г. выкладчык Полацкай духоўнай семінарыі К.А. Гаворскі. На могілках каля Ветрына ён зафіксаваў масіўныя каменныя крыжы, пліты і неапрацаваныя камяні [5, с. 99–100]. Там жа ён даследаваў маркіраванае каменным крыжам пахаванне, датуемае першай паловай XVII ст. на падставе знаходкі манеты [5, с. 99–100]. У 1901 г. Л.Ю. Лазарэвіч-Шапялевіч абследаваў могілкі з «каменнымі крыжамі прымітыўнай формы» каля в. Дубраўка Гарадоцкага павета і правёў на іх раскопкі [19, с. 1].

У канцы XIX — пачатку XX ст. з'явіліся публікацыі В. Шукевіча і А.А. Спіцына, прысвечаныя маркіраваным каменнымі канструкцыямі пахаванням сумежных рэгіёнаў. В. Шукевіч паведаміў, што на захадзе Лідскага павета ў вялікай колькасці маюцца групы магіл XIV–XV стст., абазначаных невялікімі каменнымі насыпамі круглай або авальнай формы; у галавах ці ў галавах і нагах якіх амаль заўсёды размяшчаліся вялікія абцясаныя валуны [45, с. 99–100]. На камянях у галавах/нагах авальных надмагілляў часам высечаны крыжы [47, s. 33–34]. А.А. Спіцын заўважыў падабенства наўгародскіх жальнікаў і каменных магіл у басейнах Буга і Нёмана, а таксама адзначыў наяўнасць такіх помнікаў каля Прыдруйска і ў Мінскай губерні ў вярхоўях Бярэзіны [32, с. 154–155].

Нягледзячы на назапашванне звестак аб помніках з каменнымі надмагіллямі, пахаванні XIV–XVIII стст. да канца XX ст. не былі прадметам самастойнага вывучэння і даследаваліся рэдка [16, с. 176–177]. У 1931 г. экспедыцыя на чале з А.М. Ляўданскім даследавала дзве абкладзеныя камянямі магілы каля в. Пуцілкавічы Ушацкага (XII–XIV стст.) і каля в. Хаўхоліцы Барысаўскага раёнаў (XIII–XIV стст.) [25, с. 234]. У 1935 г. У. Галубовіч і Г. Цэгак-Галубовіч раскапалі шэсць абкладзеных камянямі нізкіх курганоў (жальнікаў?) XIV ст. каля в. Чабаны (сённяшні Міёрскі раён) [6, с. 128; 44, с. 62]. У 1980-х гг. раскопкі познесярэдневяковых пахаванняў з каменнымі надмагіллямі на Беларускім Падзвінні і сумежнай з ім Цэнтральнай Беларусі праводзілі А.В. Квяткоўская (могільнікі Перавоз IV Глыбоцкага і Ваўча Докшыцкага раёнаў) [13, с. 21–22], В.М. Ляўко (могільнік Новы Болецк Гарадоцкага раёна) [26, с. 465–466], А.М. Плавінскі і В.Н. Рабцэвіч (могільнік Гаравец Барысаўскага раёна) [27, с. 337–338]. У 1990-х гг. познесярэдневяковыя пахаванні з каменнымі надмагіллямі, упушчаныя ў курганы папярэдняга перыяду, вывучаў Г. В. Ласкавы (могільнік Вышадкі Гарадоцкага раёна) [20]. Вывучэннем каменных крыжоў, познесярэдневяковых курганных і курганна-жальнічных пахаванняў займаецца *Л.У. Дучыц* [8; 9; 10; 11].

У 1990-х гг. пахаванні XIV–XVIII стст. трывала ўвайшлі ў лік археалагічных помнікаў. Такі падыход увасобіўся ў энцыклапедыі «Археалогія і нумізматыка Беларусі» (1993) [26, с. 465–466]. У чацвёртым томе акадэмічнай «Археалогіі Беларусі» (2001) упершыню з'явіліся асобныя параграфы, прысвечаныя могільнікам (Л. У. Дучыц) і іх археалагічнаму вывучэнню (Л. У. Дучыц, А. В. Іоў, В. М. Ляўко) [2, с. 124–138]. Жальнікі і каменныя магілы вылучаны ў асобную групу пахавальных помнікаў і ў найноўшым навучальным дапаможніку «Асновы археалогіі» [12, с. 22]. Гэта сведчыць аб пачатку ў 1990-х гг. якасна новага этапа ў вывучэнні пахаванняў позняга сярэдневякоўя — ранняга новага часу, калі яны пачалі ўспрымацца як самастойны прадмет даследавання.

На сучасным этапе могільнікі з каменнымі надмагіллямі даследавалі А.В. Вайцяховіч (Бірулі Докшыцкага раёна) [3], Д.У. Дук (Туржэц 2 Полацкага раёна) [7], М.В. Клімаў (Лучна II Полацкага раёна) [15], П.С. Курловіч (Ілава Шумілінскага раёна) [17] і аўтар (Бірулі Докшыцкага, Доўгае, Івесь і Васькавічы Глыбоцкага, Дубраўка Гарадоцкага, Жарнасекава і Клешчыно Бешанковіцкага, Ілава Шумілінскага, Міхалінава Лёзненскага, Мураўшчына Полацкага раёнаў) (мал. 5) [37; 38; 39; 40; 41; 42].

PolotskSU



Раскопкі на могільніку Стары Лепель Лепельскага раёна праводзіла З.А. Харытановіч (Ільчышын). Адкрытыя ёй пахаванні не былі абазначаны надмагіллямі, але на могілках меліся каменныя крыжы [35, с. 300; 43, с. 2].



**Малюнак 5. — Могільнік каля в. Івесь Глыбоцкага р-на Віцебскай вобл. Раскопкі 2015 г. Каменныя канструкцыі, ускрытыя на глыбіню да 0,4 м. Выгляд з паўднёвага ўсходу**

Агульнапрынятая тэрміналогія для апісання надмагілляў пакуль не выпрацавана, розныя аўтары карыстаюцца рознымі вызначэннямі. Напрыклад, канструкцыі ў выглядзе абкладак магілы па перыметры называюцца каменнымі агароджамі, вымасткамі ў выглядзе агароджаў, кладкамі і «калодзежамі» [2, с. 126, 136, 238; 7, с. 261–262; 8, с. 68–69; 20, с. 149]. Раскопкі 1980-х — 2010-х гг. добра задакументаваны. Надмагіллі пахаванняў, даследаваных у гэты час, падрабязна апісаны. Маюцца планы і фотаздымкі каменных канструкцый. Графічная і фотафіксацыя змяншае верагоднасць неправільна зразумець тэкставае апісанне.

Актуальнай задачай вывучэння пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. з'яўляецца класіфікацыя іх каменных надмагілляў. Пры яе вырашэнні магчыма выкарыстаць вопыт вывучэння надмагільных канструкцый сумежных рэгіёнаў і эпох. Напрыклад, польскі археолаг Л. Раўхут прапанаваў класіфікацыю каменных надмагілляў раннесярэдневяковых могільнікаў Мазовіі і Падляшша паводле формы канструкцыі і асаблівасцей размяшчэння камянёў (*табліца 1*) [46, s. 455–458]. Аналагічны падыход рэалізавала Л.В. Квяткоўскай пры класіфікацыі «каменных магіл» Беларусі (пераважна, Панямоння). Ён улічвае форму надмагілля, асаблівасці размяшчэння камянёў, наяўнасць вялікіх валуноў у галавах/нагах пахавання (*табліца 2*) [13, с. 42–46].

Побач з археалагічным маецца мастацтвазнаўчы падыход да класіфікацыі надмагільных канструкцый, які выкарыстоўваецца ў этнаграфіі. Так, М. Раманюк падзяліў надмагіллі ўсіх наяўных пахавальных помнікаў Беларусі на курганы; надмагільныя палотны жанчын; памятныя дрэвы; драўляныя кладкі (пасмяротныя кладкі жанчын); памятныя надмагільныя камяні-валуны; камяні-крыжы (жальнікі); круглыя камяні-жорны; прафіляваныя дошкі-крыжы і слупкі; прыклады; нарубы; саркафагавыя надмагіллі; сіямінутныя крыжы; кананічныя крыжы з дрэва; крыжы, увітыя ручнікамі, аздобленыя фартухамі; крыжы тыпу адкрытай капліцы; кананічныя крыжы з металу; каваныя металічныя крыжы; мураваныя

PolotskSU



лiтыя крыжы Давыд-Гарадка; мураваныя помнiкi; памятныя знакi магiл самагубцаў i няхрышчаных дзяцей [29, с. 27]. В.А. Лабачэўская вылучыла сярод вясковых надмагiлляў Беларусi надмагiльныя знакi (насыпы, курганы; каменныя абкладкi («каменныя магiлы»); камянi-валуны; меткi (сiямiнутныя крыжы); драўляныя нарубы) i надмагiльныя помнiкi (зрубы; апрацаваныя камянi; камянi са знакамi, датамi, надпiсамi; каменныя жорны; крыжы (драўляныя, каменныя, металiчныя); помнiкi-камянi з металiчнымi крыжамi; помнiкi-крыжы з дрэва; помнiкi-крыжы з бетону; абелiскi i стэлы) [24].

Табліца 1. — Класіфікацыя каменных надмагілляў раннесярэдневяковых могільнікаў Мазовіі і Падляшша паводле Л. Раўхута

| Тып | Варыянт | Апісанне |
|---|---|---|
| I | a | Плоская прамавугольная вымастка. Камяні па краях размешчаны вышэй і часам нязначна большыя за тыя, што пакладзены ў сярэдзіну. Прамавугольная магіла ад касцяка даверху запоўнена некалькімі слаямі камянёў. |
| | b | Вымастка прамавугольнай формы, сярэдзіна якой значна вышэйшая за краі. Нагадвае прамавугольны каменны курган. Магіла ад касцяка даверху запоўнена некалькімі слаямі камянёў. |
| | c | Вымастка падпрамавугольнай формы. Камяні па краях размешчаны нерэгулярна і з вялікімі прамежкамі. Камяні ў сярэдзіне размешчаны няшчыльна, з вялікімі прамежкамі, у адзін слой. |
| II | a | Абкладка падпрамавугольнай формы. Пахаванне зроблена на гарызонце або ў неглыбокай (да 0,3 м) яме. Абкладка ўтварае пахавальную камеру і запоўнена некалькімі слаямі дробных каменьчыкаў, пакладзеных вельмі шчыльна. |
| | b | Абкладка падпрамавугольнай формы. Пахаванне зроблена ў не вельмі глыбокай (да 0,7 м) яме. Прастора ўнутры абкладкі запоўнена некалькімі слаямі дробных каменьчыкаў, пакладзеных вельмі шчыльна. |
| III | — | Абкладка магілы падпрамавугольнай формы, ссунутая ў бок адносна магілы або па памерах меншая за магільную яму. Прастора ўнутры можа быць запоўнена некалькімі слаямі шчыльна пакладзеных камянёў, якія не дасягаюць узроўню пахавання. |
| IV | — | Каменная плоская вымастка з пакладзеных у 1 слой камянёў з вялім камянём у галавах. Забутоўка магілы адсутнічае. |

*Крыніца:* складзена паводле [46, s. 455–458].

Табліца 2. — Класіфікацыя надмагілляў «каменных магіл» Беларусі паводле Л. В. Квяткоўскай

| Тып | Варыянт | Апісанне |
|---|---|---|
| I | — | Кладка круглай формы. Па краях пакладзены камяні большых памераў, чым у сярэдзіне. |
| II | А | Кладка авальнай формы. Па краях пакладзены камяні большых памераў, чым у сярэдзіне. |
| | Б | Кладка авальнай формы. Па краях размешчаны камяні большых памераў, чым у сярэдзіне. У галавах размешчаны вялікія камяні без рэшткаў апрацоўкі. |
| | В | Кладка авальнай формы. Краі і сярэдзіна складзены з камянёў прыкладна аднолькавых памераў. |
| | Г | Кладка авальнай формы. У сярэдзіне пакладзены камяні большых памераў, чым па краях. У галавах і нагах часта размешчаны вялікія камяні. Камяні ў галавах пахавання часта апрацаваны (абцясаны). |
| III | А | Кладка прамавугольнай формы. Па краях пакладзены камяні большых памераў, чым у сярэдзіне. |
| | Б | Кладка прамавугольнай формы з камянёў прыкладна аднолькавых памераў. Часта ў галавах размешчаны камяні большых памераў. |
| | В | Кладка прамавугольнай формы з камянёў, пакладзеных у 3–4 радкі. У сярэдзіне пакладзены камяні большых памераў, чым па краях. |
| | Г | Кладка прамавугольнай формы з камянёў, пакладзеных у 3–5 радкоў. Па краях пакладзены камяні большых памераў, чым у сярэдзіне. У галавах і нагах размешчаны вялікія камяні. На камянях у галавах часам высечаны крыжы. |
| | Д | Кладка прамавугольнай формы з камянёў прыкладна аднолькавых памераў. У галавах і нагах размешчаны вялікія камяні з рэшткамі апрацоўкі. На камянях у галавах высечаны крыжы. |

*Крыніца:* складзена паводле [13, с. 42–46].

Вырашэнню нашай задачы відавочна адпавядае археалагічны падыход, заснаваны на дзяленні надмагілляў паводле іх формы і асаблівасцей размяшчэння камянёў. Прапануемая класіфікацыя каменных надмагілляў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст. прадстаўлена ў *табліцы 3.*

PolotskSU



Класіфікацыя прадугледжвае вылучэнне відаў, варыянтаў, тыпаў і падтыпаў каменных надмагілляў. Крытэрыем дзялення надмагілляў на віды з'яўляецца форма канструкцыі: вымастка (I), абкладка магілы па перыметры (II), асобныя камяні (III) і хаатычна размешчаныя камяні (IV). Віды I–II уключаюць варыянты, крытэрыем вылучэння якіх з'яўляецца канфігурацыя канструкцыі. Вымастка (I) можа быць поўнай раўнамернай (I.1 — камяні раўнамерна пакрываюць магілу), поўнай нераўнамернай (I.2 — камяні пакрываюць магілу з нераўнамернымі прамежкамі), частковай (I.3 — камяні пакрываюць частку магілы). Абкладка можа быць замкнёнай (II.1) і незамкнёнай, разарванай (II.2). Крытэрыем вылучэння тыпа з'яўляецца абазначэнне ў надмагіллі галавы/ног камянямі вялікіх памераў: без абазначэння (А — у нагах і галавах пахавання няма вялікіх камянёў), з вялікім камянём (Б — галава і/або ў ногі пахавання абазначаны з дапамогай вялікіх камянёў), з каменным крыжам (В). Тып Б уключае падтыпы, крытэрыем вылучэння якіх з'яўляецца размяшчэнне вялікага каменя. Камяні могуць абазначаць галаву (Б.1), ногі (Б.2) пахавання. Вялікімі камянямі могуць быць маркіраваны і галава, і ногі пахавання (Б.3).

Табліца 3. — Класіфікацыя каменных надмагілляў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стст.

<table>
<tr><th colspan="3" rowspan="3">Від і тып<br>надмагільнай канструкцыі</th><th colspan="5">Тып</th></tr>
<tr><th rowspan="2">А. Без абазначэння</th><th colspan="3">Б. Вялікі камень</th><th rowspan="2">В. Каменны крыж</th></tr>
<tr><th>Б.1. У галавах</th><th>Б.2. У нагах</th><th>Б.3. У галавах і нагах</th></tr>
<tr><td rowspan="7">Від</td><td rowspan="3">I. Вымастка</td><td>I.1. Поўная раўнамерная</td><td>I.1.А</td><td>I.1.Б.1</td><td>I.1.Б.2</td><td>I.1.Б.3</td><td>I.1.В</td></tr>
<tr><td>I.2. Поўная нераўнамерная</td><td>I.2.А</td><td>I.2.Б.1</td><td>I.2.Б.2</td><td>I.2.Б.3</td><td>I.2.В</td></tr>
<tr><td>I.3. Частковая</td><td>I.3.А</td><td>I.3.Б.1</td><td>I.3.Б.2</td><td>I.3.Б.3</td><td>I.3.В</td></tr>
<tr><td rowspan="2">II. Абкладка</td><td>II.1. Замкнёная</td><td>II.1.А</td><td>II.1.Б.1</td><td>II.1.Б.2</td><td>II.1.Б.3</td><td>II.1.В</td></tr>
<tr><td>II.2. Разарваная</td><td>II.2.А</td><td>II.2.Б.1</td><td>II.2.Б.2</td><td>II.2.Б.3</td><td>II.2.В</td></tr>
<tr><td colspan="2">III. Асобныя камяні</td><td>III.А</td><td>III.Б.1</td><td>III.Б.2</td><td>III.Б.3</td><td>III.В</td></tr>
<tr><td colspan="2">IV. Хаатычна размешчаныя камяні</td><td>IV.А</td><td>IV.Б.1</td><td>IV.Б.2</td><td>IV.Б.3</td><td>IV.В</td></tr>
</table>

Прыклад выкарыстання прапанаванай класіфікацыі для характарыстыкі каменных надмагілляў могільніка Доўгае прыведзены ў *табліцы 4*, якая дазваляе ўбачыць размеркаванне надмагілляў па відах, варыянтах, тыпах і падтыпах. Так, на даследаванай частцы могільніка Доўгае каменныя надмагіллі абазначалі 25 пахаванняў. Надмагіллі прадстаўлены канструкцыямі ў выглядзе поўнай раўнамернай вымасткі, частковай вымасткі, разарванай абкладкі, асобных і хаатычна, бессістэмна размешчаных камянёў. Разарваная абкладка маркіравала 16 пахаванняў і з'яўлялася пануючым відам надмагілля. З іх у 7 надмагіллях вялікія камяні абазначалі галаву, 2 — галаву і ногі пахавання; яшчэ ў 6 надмагіллях галава і ногі не маркіраваліся вялікімі камянямі. Дамінуючым тыпам надмагілля з'яўляюцца канструкцыі без абазначэння галавы/ног пахавання і з абазначэннем галавы пахавання вялікім камянём (11 і 10 надмагілляў адпаведна). Каменнымі крыжамі абазначаны 2 пахаванні. Адзін з каменных крыжоў знаходзіўся ў складзе разарванай абкладкі.

Такім чынам, адметнасцю Беларускага Падзвіння з'яўляецца высокая канцэнтрацыя пахавальных помнікаў XIV–XVIII стст., абазначаных каменнымі надмагільнымі канструкцыямі. Збор звестак аб каменных крыжах і іншых надмагіллях Беларускага Падзвіння пачаўся ў XIX ст. Тады ж адбыліся першыя раскопкі пахаванняў позняга сярэдневякоўя — ранняга новага часу. На працягу XIX і большай часткі XX ст. пахаванні з каменнымі надмагіллямі не былі прадметам мэтанакіраванага вывучэння. З 1980-х гг. вывучэнне гэтых помнікаў актывізавалася. На сённяшні момант на шэрагу могільнікаў XIV–XVIII стст. праведзены археалагічныя раскопкі з фіксацыяй надмагілляў. Гэта дазваляе ўзняць пытанне аб іх класіфікацыі. Прапанаваная класіфікацыя грунтуецца на традыцыйным у археалогіі дзяленні надмагілляў у залежнасці ад формы надмагільнай канструкцыі і наяўнасці ў яе складзе вялікіх камянёў, што абазначаюць галаву і ногі пахавання.

PolotskSU



Табліца 4. — Класіфікацыя каменных надмагілляў могільніка Доўгае

<table>
<tr><th colspan="3" rowspan="3">Від і тып надмагільнай канструкцыі</th><th colspan="5">Тып</th><th rowspan="3">Усяго</th></tr>
<tr><th rowspan="2">А. Без абаз-начэння</th><th colspan="3">Б. Вялікі камень</th><th rowspan="2">В. Каменны крыж</th></tr>
<tr><th>Б.1. У галавах</th><th>Б.2. У нагах</th><th>Б.3. У галавах і нагах</th></tr>
<tr><td rowspan="7">Від</td><td rowspan="3">І. Вымастка</td><td>І.1. Поўная раўнамерная</td><td></td><td></td><td></td><td>1</td><td></td><td>1</td></tr>
<tr><td>І.2. Поўная нераўнамерная</td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>І.3. Частковая</td><td>2</td><td>2</td><td></td><td></td><td></td><td>4</td></tr>
<tr><td rowspan="2">ІІ. Абкладка</td><td>ІІ.1. Замкнёная</td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td><td></td></tr>
<tr><td>ІІ.2. Разарваная</td><td>6</td><td>7</td><td></td><td>2</td><td>1</td><td>16</td></tr>
<tr><td colspan="2">ІІІ. Асобныя камяні</td><td>2</td><td>1</td><td></td><td></td><td>1</td><td>4</td></tr>
<tr><td colspan="2">IV. Хаатычна размешчаныя камяні</td><td>1</td><td></td><td></td><td></td><td></td><td>1</td></tr>
<tr><td colspan="3">Усяго</td><td>11</td><td>10</td><td></td><td>3</td><td>2</td><td>25</td></tr>
</table>

## ЛІТАРАТУРА


1. Алексеев, Л. В. Археология и краеведение Беларуси: XVI в. — 30-е годы XX в. / Л. В. Алексеев ; под ред. Б. А. Рыбакова. — Мінск : Беларуская навука, 1996. — 206 с.
2. Археалогія Беларусі : у 4 т. — Мінск : Беларуская навука, 1997–2001. — Т. 4. Помнікі XIV–XVIII стст. / В. М. Ляўко [і інш.] ; пад рэд. В. М. Ляўко [і інш.]. — 2001. — 597 с. ; іл.
3. Вайцяховіч, А. В. Справаздача пра археалагічныя даследаванні курганных могільнікаў у Докшыцкім раёне Віцебскай вобласці ў 2011 годзе / А. В. Вайцяховіч // Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Справа № 2844.
4. Волкенштейн, А. П. Несколько слов об антропологии жальников Валдайского уезда / А. П. Волкенштейн // Труды II Археологического съезда в Санкт-Петербурге. Вып. 2. — СПб. : Типография императорской академии наук, 1881. — С. 1–56.
5. Говорский, К. Археологические розыскания в окрестностях г. Полоцка / К. Говорский // Записки императорского археологического общества. — Т. V. — СПб., 1853. — С. 98–103.
6. Голубович, Е. Славянские поселения правобережной Дисны в Вилейском округе БССР / Е. Голубович, В. Голубович // Краткие сообщения о докладах и полевых исследованиях института истории материальной культуры. — М. — Л., 1945. — Вып. XI. — С. 126–137.
7. Дук, Д. У. Археалагічныя раскопкі на грунтовым могільніку Туржэц 2 Полацкага раёна / Д. У. Дук // Матэрыялы па археалогії Беларусі. — Мінск, 2008. — № 15. Археалогія эпохі Сярэднявечча. Да 80-годдзя з дня нараджэння Г. В. Штыхава. — С. 261–269.
8. Дучыц, Л. Пахавальныя помнікі наваколіц Падсвілля / Л. Дучыц, А. Квяткоўская // Гістарычна-археалагічны зборнік. — Мінск, 1994. — № 4. — С. 58–70.
9. Дучыц, Л. Курганна-жальнічныя могільнікі на тэрыторыі Полацкай зямлі (да пастаноўкі пытання) / Л. Дучыц // Гістарычна-археалагічны зборнік. — Мінск, 1996. — № 10. — С. 38–42.
10. Дучыц, Л. Каменныя крыжы / Л. Дучыц // З глыбі вякоў. Наш край : гіст.-культурал. зб. Вып. 2 / уклад. В. У. Шаблюк ; навук. рэд. А. К. Краўцэвіч. — 2-е выд. — Мінск : Бел. навука, 2002. — С. 31–47.
11. Дучыц, Л. Курганна-жальнічны могільнік каля в. Малявічы Вілейскага раёна / Л. Дучыц, А. Вайцяховіч, П. Кенька // Гістарычна-археалагічны зборнік. — Мінск, 2007. — Вып. 23. — С. 152–166.
12. Калядзінскі, Л. Уводзіны ў археалогію / Л. Калядзінскі. — Гродна : Юрсапрынт, 2012. — 240 с. ; іл.
13. Квятковская, А. В. Ятвяжские могильники Беларуси (к. XI–XVII вв.) / А. В. Квятковская. — Вільнюс : Diemedžio, 1998. — 327 с. ; ил.
14. Кеппен, П. Список русским памятникам, служащим к составлению истории художеств и отечественной палеографии / П. Кеппен. — М. : В типографии С. Селивановского, 1822. — С. А–К + VIII с. +119 с.

PolotskSU




15. Клімаў, М. В. Лучанскі грунтовы могільнік II : пытанні археалагічнай інтэрпрэтацыі / М. В. Клімаў // Віцебскія старажытнасці : матэрыялы навуковых канферэнцый / рэдкал. : Г. У. Савіцкі [і інш.]. — Мінск : Нацыянальная бібліятэка, 2013. — С. 121–125.
16. Климов, М. В. Погребальные памятники полоцкой округи XIII–XVIII вв. / М. В. Климов, В. В. Черевко // Полоцк: Полоцк и Полоцкое княжество (земля) в IX–XIII вв., летопись древних слоев, Полоцк и его округа в XIV–XVIII вв., ремесло, денежное обращение и торговые связи Полоцка в средневековье (по данным археологии, нумизматики и письменных источников), культура и просвещение в средневековом Полоцке / О. Н. Левко [и др.] ; редкол. : А. А. Коваленя (гл. ред.) ; науч. ред. О. Н. Левко. — Минск : Беларуская навука, 2012. — С. 176–182.
17. Курлович, П. С. Курган у деревни Илово Шумилинского района (итоги археологических и антропологических исследований 2016 г.) / П. С. Курлович, Н. Н. Помазанов // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі : Шумілінскі край : зб. навук. арт. / навук. рэд. В. М. Ляўко ; рэдкал.: В. В. Даніловіч [і інш.]. — Мінск : Бел. навука, 2018. — С. 167–173.
18. Кусцинский, М. Ф. Надгробный камень над павшими в сражении в 1568 г., найденный в Лепельском уезде Витебской губернии / М. Ф. Кусцинский // Древности. Труды Московского археологического общества. — М., 1874. — Т. IV. — С. 92–93.
19. Лазаревич-Шепелевич, Л. Ю. Извлечение из отчета об исследованиях и раскопках, произведенных в 1901 г. в Витебской губернии / Л. Ю. Лазаревич-Шепелевич // Известия императорской археологической комиссии. Вып. 6. — СПб. : Тип. главного управления уделов, 1904. — С. 1–5.
20. Ласкавы, Г. В. Курганы з каменнымі выкладкамі на паўночным усходзе Беларусі (па матэрыялах курганнага могільніка Вышадкі) / Г. В. Ласкавы, І. М. Лаппо // Гістарычна-археалагічны зборнік. — Мінск, 1994. — № 3. — С. 148–160.
21. Леонова, Н. Б. Погребение как объект формального анализа / Н. Б. Леонова, Ю. А. Смирнов // Краткие сообщения института археологии. — 1977. — Вып. 148. — С. 16–23.
22. Лобач, У. А. Міф. Прастора. Чалавек: традыцыйны культурны ландшафт беларусаў у семіятычнай перспектыве / У. А. Лобач. — Мінск : Тэхналогія, 2013. — 510 с.
23. Лобач, У. А. Курганы, гарадзішчы, скарбы: «вясковая археалогія» на тэрыторыі Віцебшчыны ў XIX–XX стст. / У. А. Лобач // Беларускі фальклор : матэрыялы і даследаванні : зборнік навуковых прац. — Вып. 4. — Мінск : Беларуская навука, 2017. — С. 10–39.
24. Лобачевская, О. А. О типологизации надмогильных знаков и памятников на деревенских кладбищах Беларуси конца XIX–XX вв. (по материалам иконографии и полевых исследований) / О. А. Лобачевская [: 6-asis prigimtinės kultūros seminaras «Ryšiai tarp gyvųjų ir mirusiųjų lietuvių prigimtinėje kultūroje» (Užutrakis, 2015 m. kovo 14–15 d) : видеозапись выступления] [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://tautosaka.llti.lt/media/filer_public/cc/52/cc525ce4-17e7-4c21-bea2-8d46f4f203dd/ltrv_655-07.mp4. — Дата доступа: 02.10.2018.
25. Ляўданскі, А. Кароткае паведамленьне аб досьледах культур эпохі жалеза ў БССР у 1930–1931 гг. / А. Ляўданскі // Працы сэкцыі архэолёгіі. — Мінск, 1932. — Т. III. — С. 230–235.
26. Ляўко, В. М. Новы Болецк / В. М. Ляўко, В. І. Шадыра // Археалогія і нумізматыка Беларусі. — Мінск : БелЭн, 1993.— С. 464–466.
27. Плавінскі, М. А. Сярэднявечны могільнік Гаравец у вярхоўях Бярэзіны / М. А. Плавінскі // Культурний шар. Статті на пошану Гліба Юрійовича Івакіна. — Київ : Лаурус, 2017. — С. 337–354.
28. Природа Белоруссии : попул. энциклопедия / редкол. : И. П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. — 2-е изд. — Минск : БелСЭ, 1989. — 599 с. ; ил.
29. Раманюк, М. Беларускія народныя крыжы / М. Раманюк. — М.а. : Наша Ніва, 2000. — 221 с. ; іл.
30. Сапунов, А. Памятники времен древних и новейших в Витебской губернии / А. Сапунов. — Витебск : Типолитография Бр. Г. и П. Подземских, 1903. — 97 с. ; ил. — (Оттиск из «Памятной книжки Витебской губернии» на 1903 г.).
31. Седов, В. В. Жальники / В. В. Седов // Российская археология. — 2000. — № 1. — С. 7–22.
32. Спицын, А. А. Сопки и жальники / А. А. Спицын // Записки императорского русского археологического общества. Новая серия. Том XI. Вып. 1–2. Труды отделения славянской и русской археологии. Кн. 4. — Санкт-Петербург: Тип. И. Н. Скороходова, 1899. — С. 142–155.
33. Труды Виленского отделения Московского предварительного комитета по устройству в Вильне IX Археологического съезда. — Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1893. — XI с. + 170 с. + XVIII с. + 371 с. + 104 с.
34. Формозов, А. А. Очерки по истории русской археологии / А. А. Формозов. — М. : Издательство Академии наук СССР, 1961. — 128 с.
35. Харытановіч, З. А. Археалагічныя даследаванні на гарадзішчы і селішчы Стары Лепель у 2008 г. / З. А. Харытановіч // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. — Мінск, 2011. — Вып. 20. — С. 300–307.

PolotskSU




36. Чараўко, В. У. Матэрыялы да карты пахавальных помнікаў Беларускага Падзвіння XIV–XVIII стагоддзяў / В. У. Чараўко // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. — 2010. — № 7. — С. 14–20.
37. Чараўко, В. У. Праблема датавання познесярэднявечных грунтовых пахаванняў на курганна-жальнічным могільніку каля в. Бірулі Докшыцкага раёна (па матэрыялах даследаванняў 2011 г.) / В. У. Чараўко // Полацкі музейны штогоднік (зборнік навуковых артыкулаў за 2011 г.) / уклад. Т. А. Джумантаева, І. П. Воднева, С. В. Нікалаева. — Полацк : НПГКМЗ, 2012. — С. 356–362.
38. Чараўко, В. У. Археалагічнае вывучэнне грунтовых пахаванняў XVI–XVIII стагоддзяў на могільніку каля в. Клешчыно Бешанковіцкага раёна ў 2013 годзе / В. У. Чараўко // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. — 2015. — № 9. — С. 84–89.
39. Чараўко, В. У. Археалагічныя раскопкі на могільніку каля в. Жарнасекава Бешанковіцкага раёна Віцебскай вобласці ў 2013 г. / В. У. Чараўко // История и культура на стыке эпох и цивилизаций: историко-культурное наследие как ресурс и результат развития общества. Материалы Международной научно-практической конференции, посвящённой 250-летию М. К. Огинского (Минск, 25–26 сентября 2015 г.). — Минск : Белнаучкнига, 2015. — С. 122–127.
40. Чараўко, В. У. Археалагічныя раскопкі на могільніку каля в. Івесь Глыбоцкага раёна ў 2012 г. / В. У. Чараўко // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. — 2014. — Вып. 25.— С. 382–389.
41. Черевко, В. В. Археологические исследования на могильнике возле д. Дубровка Городокского района в 2014 г. / В. В. Черевко // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. Гуманитарные науки. — 2016. — № 1. — С. 153–161.
42. Черевко, В. В. Внемогильный инвентарь позднесредневековых погребений могильника Михалиново Лиозненского района и его информативность / В. В. Черевко // Проблемы истории и культуры пограничья: гуманитарное знание и вызовы времени : материалы Международной научной конференции, посвящённой 200-летию И. Е. Храповицкого, Верхнедвинск, 16 июня 2017 г. — Минск : Белнаучкнига, 2017. — С. 183–186.
43. Штыхов, Г. В. Отчёт об исследованиях Полоцко-Витебского археологического отряда в 1969 г. / Г. В. Штыхов / Фонд археалагічнай навуковай дакументацыі Цэнтральнага навуковага архіва Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Справа № 350.
44. Штыхов, Г. В. Археологическая карта Белоруссии. Памятники железного века и эпохи феодализма. Вып. 2 / Г. В. Штыхов. — Минск : Полымя, 1971. — 276 с.
45. Шукевич, В. Об археологических местностях в Лидском и Трокском уездах / В. Шукевич // Труды Виленского отделения Московского предварительного комитета по устройству в Вильне IX Археологического съезда. — Вильна : Типография А. Г. Сыркина, 1893. — С. 96–100.
46. Rauchut, L. Wczesnośredniowieczne cmentarzyska w obudowie kamiennej na Mazowszu i Podlasiu / L. Rauchut // Materiały starożytne i wczesnośredniowieczne. T. I. — Wrocław : Zakł. Nar. im. Ossolińskich, 1971. — S. 435–656.
47. Szukiewicz, W. Kurhany kamienne w powiece Lidzkim (gub. Wileńska) / W. Szukiewicz // Światowit. – 1899. – T. I. — S. 32–38.
48. Tyszkiewicz, E. Opisanie powiatu Borysowskiego pod względem statystycznym, geognostycznym, historycznym, gospodarczym, przemysłowo-handlowym, lekarskim / E. Tyszkiewicz. — Wilno : Drukarnia Ant. Marcinowskiego, 1847. — III s. + 446 s. + 43 s. + IV s.
49. Tyszkiewicz, K. O kurhanach na Litwie i Rusi Zachodniej. Studyum archeologiczne / K. Tyszkiewicz. – Berlin : W księgarni B. Behra, 1868. — VI s. + 287 s.


## GRAVESTONE CONSTRUCTIONS OF THE BELARUSIAN DVINA REGION OF THE 14th-18th CENTURIES

*V. CHARAUKO*

*A variety of the stone constructions with the stone covering, piled stones, individual stones, stone crosses and their combinations often are the markers that denote the burials of the Belarusian Dvina region of the 14th–18th centuries. They are found in rural cemeteries of the region, mainly on the left bank of the Western Dvina. A significant accumulation of the stones in Northern Belarus is a natural factor which contributed to the emergence of the gravestone constructions. The exact form of the gravestone construction can be established during the archaeological excavations only. The article proposes a classification of the gravestone constructions of the Belarusian Dvina region of the 14th–18th centuries. It based on the configuration of the stone construction and the head or legs designation of the burial.*

***Keywords:*** *Belarusian Dvina region, funerary monuments of the 14th–18th centuries, burials, graves with an underground stone construction, gravestone constructions, archaeological excavations.*